# Хуткамоўкі Рыгора Барадуліна



*Лапатушкі-хуткамоўкі*

Бач,
Як навастрылі вушкі
Хуткамоўкі-балбатушкі.
І балбочуць, і якочуць.
Ці не збегчы з дому хочуць?
***
У нябачаннай кватэры
Дзверы
Зробіма з паперы.
Хуткамоўкі змоўкнуць крышку,
Покуль не разгорнем кніжку.
***
Пасвішчы на пасвішчы,
Курапатак пасвячы.
А, карчуючы карчы,
Пра харчы карцу крычы.
***
Спакойна шпакоўню ціхую
Шукае шпак са шпачыхаю.
***
Ехалі ў вясёлай згодзе
Параход на карагодзе,
Карагод на параходзе.
Ім казала пара: годзе!
***
Калі жывеш на хутары,
З каіпутарам пагутары.
***

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Не наступі на золку
На золкую зёлку.
***
Каштуе колькі колкі
Коннчык іголкі?
***
Каню не кажы,
Што канюшына ў кашы.
***
Рэха вывалілася з арэха
І паехала ў рэхава.
***
У Клічава сваё клічава,
У Крычава сваё крычава.
У Лепеля сваё лепліва.
У Магілёва сваё імглёва.
***
Звалілася з вяза ваза,
А з бука
Азбука.

## *Хуткамоўкі з Паміра*

У верблюда гарбы,
У вярбы скарбы.
***
Кладзі каменьчыкі на каменьчыкі,
Глядзі, каб каменьчыкаў меншала.
***
Сто сабак і тры сабакі –
Сто тры сабакі хапаюць за бакі.
***
Гэты тутоўнік, не гэны тутоўнік,
У двары два тутоўнікі тоўпяцца.
***
Сто галоў – адна галава,
Галаве не гавары пра боль галавы.
***
Шэсць васпадаў ці чулі, ці снілі,
Што з вады іх цяснілі ў цясніне.
***
У калодзежы вада халодзіцца.
***
Шэсцьдзесят самшытаў сыйшліся –
Сумна шумяць, шум не суняць.
***
Просіць у дзеда ўнук-гультай:
“Мне дай міндаль”.
***
Малая маме кажа пра смак:
“З усіх прысмакаў смачнейшы праснак”.
***
З адной цясніны вада цячэ,
З другой цясніны бяда ўцячэ.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

***

Рыбакі мяркуюць у будане:
Рыба хвастом баўтане ці не.

***

Ты з'ясі надкушаную грушыну,
Мне дасі сушку струшчаную.

***

Пад воблакам лісця я блукаў,
Каб нарэшце натрэсці яблыкаў.

***

Ці роўна будзе, ты памяць папяць,
Пятнаццаць на пяць,
Альбо пяцьдзесят і пяць на пяць?

***

Галубы кацілі жалуды Ў жалабы,
А галубкі галубянятак кармілі з дзюбкі.

***

Без напарстка палец пракалю,
Перашываючы сорак кіп паркалю.

***

Меней сорак кіп паркалю вашага,
Чым нашага сорак кіп важылі;
Сорак ды сорак кіп, Прыкінь, колькі будзе коп?

***

Верабейку выбіралі цюбецейку.

***

Бяжы на базары Шахрысядзь
Кавуны за шэсць шэлегаў узяць.

*Літаратура:*

Барадулин, Р. Выпаў грук у грома з рук: Лапатушкі, цвялілкі, бубнілкі, пацешкі : Для дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту / Р. Барадулін. Уклад. Ул. Сіўчыкаў ; маст. А. Карповіч. Мінск: "Радыёла-плюс", 2009. – 160 с.: іл.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ